Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

# УРОК 31

## УСЁ СВОЙ ЧАС МАЕ. Я. КУПАЛА. «ХЛОПЧЫК І ЛЁТЧЫК»; Э. АГНЯЦВЕТ. «ХТО ПАЧЫНАЕ НОВЫ ДЗЕНЬ?»

**Мэта:** стварыць умовы для фарміравання правільнага асэнсаванага чытання ўголас цэлымі словамі, развіцця звязнага маўлення; спрыяць развіццю арфаэпічных уменняў, чытацкіх уменняў праз працу з прымаўкамі; садзейнічаць фарміраванню ўмення выказваць свае меркаванні аб будучай прафесіі, пачуцця павагі да людзей розных прафесій.

**Абсталяванне:** падручнік, карткі з літарамі для працы ў групах.

### ХОД УРОКА

**I. Арганізацыйны этап**

Настаўнік: Весела звініць званок,
Пачынаем наш урок.
Добры дзень! Сядайце.
Дзверы ў веды адчыняйце.
Ці ўсе правільна сядзяць?
Ці ўсе ўважліва глядзяць?

— Што нам патрэбна, каб урок быў паспяховым? *(Увага, цярпенне, працаздольнасць, дружба, акуратнасць, стараннасць, руплівасць, цікаўнасць.)*

— Давайце ўсё гэта возьмем з сабой і пачнем працаваць.

**II. Моўная размінка**

*Дзецям з працай трэба знацца,*
*Пасабляй бацькам у працы.* (А. Александровіч)

• Прачытайце вочкамі.
• Прачытайце шэптам.
• Прачытайце ўголас павольна.
• Прачытайце ўголас хутка 3 разы падрад.
• Прачытайце ў адпаведнасці з лагічным націскам. (Настаўнік паказвае слова, на якое трэба зрабіць лагічны націск.)

— Што значыць выраз «знацца з працай»?
— Да чаго заклікае аўтар?

**III. Праверка дамашняга задання**

• Гульня «Ты мне — я табе».
Дзеці задаюць пытанні, якія склалі да віктарыны па казках.
• Гульня «Пазнай казку».
Дзеці па малюнках адгадваюць казкі.

**IV. Праца па тэме ўрока**

***1. Знаёмства з новым раздзелам.***

• Праца над назвай раздзела.
— Прачытайце назву раздзела. Якія ўрокі дае нам кожны дзень жыццё? *(Вучыць быць добрымі, працавітымі, ветлівымі, праўдзівымі.)*
Творы, якія мы будзем чытаць у гэтым раздзеле, будуць нас таксама вучыць жыццёвай мудрасці.
• Праца з эпіграфам.
— Прачытайце словы М. Маляўкі. Як вы разумееце два апошнія радкі?
• Чытанне прыказак.
— Ці згодны вы з народнай мудрасцю?

***2. Падрыхтоўка да ўспрымання зместу тэкста.***

• Чытанне дыялога Васілінкі і Лянка на с. 4.
— Аб чым размаўлялі дзеці?
— Што трэба рабіць, каб атрымаць прафесію?
— Кім хоча быць Васілінка, а кім — Лянок?
• Лексічная работа са словамі на с. 4.

***3. Першаснае чытанне верша «Хлопчык і лётчык» настаўнікам.***

— Кім хоча быць хлопчык?

***4. Чытанне твора вучнямі па адным слупку і аналіз зместу твора.***

— Колькі гадоў хлопчыку?
— Што хлопчык хоча пабачыць? Зачытайце.



Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

— Да каго ён звяртаецца па дапамогу?
— Што абяцае хлопчык лётчыку?
• Чытанне ў парах.
— Што значыць «лётаць у сне»?
• Чытанне праз радок (адзін радок чытаюць хлопчыкі, другі — дзяўчынкі).
— Якім вы ўяўляеце сабе хлопчыка?
• Выразнае чытанне.
• Гульня «Перакладчыкі». Настаўнік называе слова з верша на рускай мове, дзеці перакладаюць на беларускую.
Словы для гульні: мальчик, знай, бродит, летом, забота, звёзды, Луна, надоело.
• Гульня «Будзь уважлівы». Вучні пальчыкамі паказваюць «+» або «–» у адпаведнасці са словамі настаўніка.
*Хлопчыку восем год (7).*
*Ён ходзіць у школу (у дзіцячы сад).*
*Ён умее лётаць на самалёце (у сне).*
*Хлопчык хоча паглядзець на сонца (на зоркі).*

***Фізкультхвілінка***

Раз, два, тры, чатыры, пяць, *(хадзьба на месцы)*
Выйшлі зранку працаваць
Лётчык, повар, машыніст, *(рыўкі рукамі)*
Выхавальнік, трактарыст,
Экскаватаршчык, пажарнік, *(павароты тулава)*
Будаўнік, урач, настаўнік.
У цябе хачу спытаць: *(хадзьба на месцы)*
Кім жа ты жадаеш стаць? *(Т. Шылько)*

• Віктарына «Адгадай прафесію» (загадкі ў падручніку на с. 6—7).
• Гульня «Склады пераблыталіся».
Складзіце назву прафесіі. Раскажыце, чым займаюцца прадстаўнікі гэтай прафесіі:

| | |
|---|---|
| ФЁР-ША | ВЕЦ-ПРА-ДА |
| НІК-ТАЎ-НАС | РЫСТ-ТРАК-ТА |
| ТАР-ДОК | Я-НЕР-ЦЫ-ЛІ-МІ |

• Гульня «Дабаў слоўца».
Паслухайце ўважліва верш і пастарайцеся дапоўніць яго патрэбнымі словамі.

Даглядае пчол ___________,
Стол майструе ___________,
Шыбы ў вокны ставіць ___________,
Беліць сцены ___________.
Чысціць комін ___________,
Сыры варыць ___________,
Ну а цукар — ___________.
З футра выкраіў каўнер
Мне на паліто ___________,
Боты мне пашыў ___________,
Новыя штаны — ___________.
Хто даглядае трактары,
А хто — коней на стайні,
А хто вучыць нас? ___________.
Цяпер сам разбяры,
А што робяць ганчары,
Бандары, цесляры,
Маляры, млынары,
Дактары, друкары.

Словы для даведкі: сталяр, пчаляр, шкляр, маляр, камінар, цукравар, сыравар, кушнер, шавец, кравец, настаўнік, конюх, трактарыст.

***5. Падрыхтоўка да ўспрымання зместу верша «Хто пачынае новы дзень?».***
— Пра якую прафесію марыце вы? Раскажыце.
— Што трэба, каб дасягнуць сваёй мары?

***6. Чытанне верша «Хто пачынае новы дзень?» настаўнікам на с. 7—8.***
— Дык хто пачынае новы дзень?



Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru